ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
31
ЖНІЎНЯ
№ 22(1615)

ПАГАДНЕННЕ ЗАКЛЮЧАНА

## «Жывая вада»

18 мая 1989 года ў нашай газеце быў надрукаваны матэрыял М. Дзябёлы «Жывая вада», у якім узнімалася праблема прымянення ў сельскай гаспадарцы рэспублікі поліметалічных водных канцэнтратаў (ПВК). Як паведамілі рэдакцыі, паміж універсітэтам і Беларускім навукова-даследчым інстытутам глебазнаўства заключаецца дагавор аб расшырэнні работ па прымяненню ПВК, распрацоўваецца сумесная навукова тэхнічная праграма.

Рэспубліканскае аб'яднанне «Белсельгасхімія» таксама разгледзела карэспандэнцыю «Жывая вада». Старшыня аб'яднання В. В. Шувалаў паведамляе:

«Поліметалічныя водныя канцэнтраты пакуль не ўключаны ў спіс дазволеных да шырокага прымянення пад сельскагаспадарчыя культуры матэрыялаў. Таму Беларускім навукова-даследчым санітарна-гігіенічным інстытутам разам з БелНДІ земляробства будуць праведзены шматпланавыя даследаванні якасці сельгаспрадукцыі, атрыманай пры дабаўленні ПВК, г. зн. будзе вывучана харчовая і біялагічная каштоўнасць прадуктаў, уздзеянне ПВК на здароўе людзей. Толькі пасля атрымання станоўчых вынікаў гэтых доследаў з'явіцца магчымасць шырокага прымянення ПВК»,

Прывітанне, альма-матэр!







Фотакалаж С. ГРЫЦА.







31 жніўня а 19-й гадзіне ўсе-усе запрашаюцца на вечар, прысвечаны Святу ведаў, які адбудзецца ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна.

Шапацяць лісткі календара, перагортваемыя ветрыкам часу. Вокамгненна праляцела чарговае студэнцкае лета. І тое, што яшчэ зусім нядаўна было хвалюючым, доўгачаканым, радасным і калі-нікалі сумным, засталося хіба толькі ва ўражлівай студэнцкай памяці.

Пінг-понг

## НАЯЎНАЕ І ЖАДАНАЕ

Ці будзе універсітэт удзельнічаць у восеньскіх сельгасработах? Што датычыць мяне, то я згодны. Калі толькі не будуць падлічваюца потым вынікі працоўнага месяца ў адзінках загубленага часу, а студэнтаў не прымусяць пакінуць месца дыслакацыі з адчуваннем уласнай надакучлівасці. Як здарылася ў мінулым годзе, калі кіраўнікі гаспадарак імкнуліся вырашыць свае праблемы колькаснымі метадамі.

Барыс МАЛАШЭНКА,
студэнт.

Як не зразумець асцярог Барыса? Сапраўды, у мінулым годзе, нягледзячы на загад № 217 «Аб прыцягненні да восеньскіх палявых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і сярэдніх спецыяльных устаноў», які даў студэнтам права не выходзіць на работы, не звязаныя з уборкай ураджаю, у выпадку адсутнасці фронта работ, належных умоў працы і быту неадкладна ўзнімаць перад мясцовымі органамі пытанне аб вяртанні на заняткі. Загад загадам, а на месцах здаралася рознае.

І ўсё ж, узнімаючы лозунг добраахвотнасці ў «бульбяной» справе, патрэбна ўлічваць і іншае, аб чым гаварылі на нарадзе з прадстаўнікамі рэктарата, дэканатаў і грамадскіх арганізацый кіраўнікі гаспадарак.

Валянціна Яфрэмаўна СІНЯКОВА, вядучы спецыяліст па кадрах, спецрабоце і грамадзянскай абароне Бялыніцкага РАПА:

— Камбайны без людзей працаваць не будуць. Таму, каб сабраць і захаваць ураджай з плошчы болей за 3 тысячы гектараў, нам патрэбна каля 1500 чалавек. Лічба 120, якую прапануе нам універсітэт, побач з ёй выглядае такой невялікай! Сваімі ж сіламі мы будзем збіраць бульбу да першага снегу. Уяўляеце сабе, якую колькасць бульбы мы знішчым у зямлі. А колькі такая нядбайнасць будзе каштаваць дзяржаве?

На нараду разам з Валянцінай Яфрэмаўнай прыехалі прадстаўнікі гаспадарак, якія засталіся без рабочай сілы, — калгасаў «Камінтэрн», імя У. І. Леніна, «Запаветы Леніна», саўгаса «Іскра». Усе яны сцвярджалі: «Без дапамогі ўраджай загіне».

Колькі гадоў «класічнай» студэнцкай «бульбе»? Недапушчальна. Безгаспадарча адрываюць студэнтаў ад заняткаў на цэлы месяц. І ўсё ж «бульба» застанецца справай звычайнай яшчэ гадоў на дзесяць. Пакуль студэнты, побач з іншымі прыцягнутымі сіламі, з'яўляюцца, па сутнасці, асноўнай вытворчай адзінкай, якая забяспечвае ўборку ўраджаю. Адмаўленне нельга лічыць выйсцем са становішча. А вось аб разумнай арганізацыі паклапаціцца не пашкодзіла б. Каб за непрымальныя ўмовы пражывання, за вымушаныя прастоі, за імкненне да стварэння «гумавых» атрадаў нядбайнаму кіраўніку таксама давялося раскашэльвацца. Гэтаму павінна спрыяць заключэнне дагавораў на выкананне сельскагаспадарчых работ студэнцкім атрадам. Прымаючыя арганізацыі ў іх абавязваюцца забяспечыць перавозку членаў атрада ад месца фарміравання да месца дыслакацыі, а таксама штодзённа да месца работы і назад, прадаставіць студэнтам бясплатнае жыллё і дапаможныя памяшканні, у якіх маецца неабходны інвентар і пасцельныя прыналежнасці, стварыць бяспечныя ўмовы працы, арганізаваць якаснае трохразовае харчаванне.

Пры невыкананні абавязацельстваў з аднаго боку, другі мае права скасаваць дагавор.

Тэарэтычна, на паперы праблем у студэнцкіх атрадаў пакуль няма. Што чакае іх далей?

У наступных нумарах чытайце матэрыялы выязной рэдакцыі «Беларускага універсітэта».

### Зварот

**Паважаныя студэнты універсітэта!**

**У сувязі з сітуацыяй, якая склалася на ўборцы ўраджаю ў Магілёўскай вобласці, звяртаемся да вас з просьбай: у верасні гэтага года прыняць актыўны ўдзел у аказанні дапамогі працаўнікам падшэфных раёнаў.**

**Ваша праца будзе канкрэтным укладам у справу перабудовы.**

РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ
ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ

ПРАПАНУЮ СПРАВУ

## Майстры, а не саматужнікі

Сёння універсітэт — гэта шасцідзесяцівасьмігадовая гісторыя, гэта 12 факультэтаў, якія рыхтуюць спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі рэспублікі і краіны.

Сёння універсітэт — гэта недахоп вучэбных аўдыторый, цесныя інтэрнаты, адсутнасць нармальных умоў для быту і адпачынку. І гэта ўсё на фоне эканамічнага крызісу ў краіне, дэфіцыту мыла, пральнага парашку, дэфіцыту міласэрнасці і канструктывізму. Што далей? Куды далей? Нешта ж патрэбна рабіць.

На мой погляд, вялікую ролю ў вырашэнні многіх праблем грамадства можа і павінен адыграць камсамол і камсамольская арганізацыя універсітэта — як адзін з яго атрадаў. Гэта павінна быць якасна новая арганізацыя моладзі. Грамадству не патрэбна «пажарная каманда», якую накіроўваюць на затыканне шматлікіх «дзірак», а потым крычаць: «Зноў камсамол ўсё заваліў. Яму нічога нельга даручыць». Аднак як толькі з'яўляецца наступная «дзірка», зноў па трывозе падымаюць камсамол.

Спажывецкія адносіны раз'ядалі таксама камсамол знутры. Ад многіх членаў саюза часта можна пачуць: «А што камсамол зрабіў ці можа зрабіць для мяне?». У адказ заўсёды ўзнікае жаданне спытаць: «А што ты хочаш ад камсамола?» Што ты можаш сам прапанаваць сваім таварышам па саюзу, акрамя абстрактнага крытыканства, якім усе ўжо сыты?» Такая сітуацыя зразумелая. Нас вельмі доўга прывучалі да парадку, калі людзі чакалі ўказанняў зверху: калі сеяць, калі праводзіць камсамольскія сходы, калі выходзіць з перадавымі пачынамі. Зразумела, але ад гэтага не лягчэй.

І кабператварыцца з ведамства па справах моладзі ў палітычную камуністычную арганізацыю, камсамолу патрэбна вызваліцца ад людзей, інтарэсы якіх далёкія ад палітычнай дзейнасці і накіраваны толькі на задавальненне сваіх попытаў. Я не асуджваю такіх людзей, выбар ладу жыцця — іх права, але яны разрыхляюць нашы арганізацыі, робяць іх малаініцыятыўнымі, якія з цяжкасцю паддаюцца кіраванню, аб іх песімізм разбіваюцца многія нядрэнныя маладзёжныя пачыnanні. Няхай гэтыя рабяты будуць нядрэннымі студэнтамі, якія паважаюць Канстытуцыю, прычым жа тут камсамол. Членства ў камсамоле, любой іншай арганізацыі павінна быць уласнай справай кожнага і не даваць нейкіх прывілей.

Сёння нам патрэбны саюз актыўных аднадумцаў, які шляхам шырокіх дыскусій выпрацоўвае адпаведны пункт гледжання на вырашэнне праблем грамадства, моладзі. І потым з дапамогай сваіх дэпутатаў, іншых канструктыўных магчымасцей праводзіць іх у жыццё. Прычым, у гэтай праграме члены саюза зыходзяць не толькі з асабістых інтарэсаў, а перш за ўсё з інтарэсаў грамадства.

Нам патрэбны палітычны саюз, які адмаўляецца ад манаполіі на моладзь. Мы за тое, каб маладыя людзі, якія адрозніваюцца ад нас палітычнымі поглядамі, у рамках Канстытуцыі стварылі свае арганізацыі. Пара аднадумнасці і аднолькавасці прайшла. Гэта рэальнасць жыцця. Таму камітэт камсамола універсітэта за канструктыўны дыялог з усімі фармальнымі і нефармальнымі арганізацыямі. Мы за супрацоўніцтва, за дыскусію, за аргументаваную крытыку ўсяго таго, чаго не прымаем.

Галоўную сваю задачу камсамол БДУ бачыць у паляпшэнні падрыхтоўкі спецыялістаў. Мы вітаем тых, хто з першага дня ва універсітэце настойліва ўгрызаецца ў граніт навукі. Краіне патрэбны майстры, а не саматужнікі.

Але жыццё пераконвае, што абмяжоўвацца толькі вучобай і навукай недастаткова для сучаснага высокакваліфікаванага спецыяліста. Будучым настаўнікам, арганізатарам вытворчасці патрэбна добрая школа грамадскай дзейнасці. Згуртаваць, аб'яднаць людзей, зразумець іх, зацікавіць, захапіць карыснай справай — гэтаму па кнігах не навучышся, праз гэта патрэбна прайсці самому.

Так што чакаем вас, нашы таварышы па маладзёжнаму саюзу, у камітэце камсамола універсітэта. Чакаем усіх з цікавымі і нецікавымі прапановамі, з канструктыўнай крытыкай і жаданнем дзейнічаць. А работы сёння непачаты край. Хочам стварыць клуб беларускай гісторыі і культуры, курсы беларускай мовы. Пара абсталяваць утульныя відэасалоны у інтэрнатах, расшырыць дзейнасць маладзёжнага гаспадарча-разліковага прадпрыемства «Універсітэт», якое дасць магчымасць студэнтам зарабляць грошы, працуючы па спецыяльнасці.

А галоўнае, патрэбна стварыць новую структуру студэнцкага самакіравання, якая б абараняла інтарэсы студэнтаў, аказвала актыўнае ўздзеянне на павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу.

Сёння універсітэт — гэта 10 тысяч маладых, адукаваных, энергічных людзей, ад якіх залежыць іх сённяшні і заўтрашні дзень, сёння і заўтра Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

В. ШАДУРСКІ,
сакратар камітэта камсамола.

НЕАДКЛАДНА!

# Студэнты, вольна!



**176 тысяч ваеннаслужачых-студэнтаў па рашэнню сесіі Вярхоўнага Савета СССР вернуцца на вучобу. У ліку шчаслівчыкаў і больш за 700 навучэнцаў нашага універсітэта.**

Адпаў яшчэ адзін штучны бар'ер на (і без таго цярністым) шляху да ведаў. Аднак не бясследна знікла гэтая перашкода. Рэха «студэнцкага прызыву» яшчэ доўгі час будзе адгукацца ў студэнцкіх аўдыторыях і лабараторыях. Ужо зараз нямала праблем у сувязі са звальненнем такога вялікага кантынгенту навучэнцаў узнікла ва універсітэце ды і самім студэнтам напачатку нялёгка будзе акліматызавацца.

Аб тым, як рыхтуецца сустрэць родная «альма-матэр» сваіх дэмабілізаваных сыноў, наш карэспандэнт гутарыць з прарэктарам па вучэбнай рабоце ВАЛЕРЫЕМ ГУР'ЕВІЧАМ ЦІХІНЯЙ.

— Пастанова Вярхоўнага Савета СССР аб звальненні з абавязковай вайсковай службы студэнтаў стала для саміх навучэнцаў і іх выкладчыкаў прыемнай нечаканасцю. А колькі «нечаканых непрыемнасцей» прынесла гэта раптоўнае рашэнне адміністрацыі універсітэта?

**В. Г. ЦІХІНЯ:** Пэўныя праблемы, вядома, узніклі. І самая складаная з іх — забеспячэнне жыллём усіх звольненых з радоў СА студэнтаў. Часткова гэтую праблему вырашылі агульнымі намаганнямі сумесна з Мінскім індустрыяльна-педагагічным тэхнікумам. У інтэрнатах гэтай навучальнай установы сёлета знойдуць прытулак прыкладна 100 дэмабілізаваных студэнтаў. Для таго, каб уладкаваць астатніх, давядзецца ў некаторыя пакоі засяляць па 4 чалавекі. У цеснаце, як кажуць, але не ў крыўдзе. Так што месца ў інтэрнаце атрымае кожны студэнт, што вярнуўся зараз з войска. Калі, вядома, мае ў ім патрэбу.

Усе гэтыя студэнты, між іншым, будуць атрымліваць стыпендыю на працягу навучальнага года незалежна ад вынікаў сесіі.

— А якая дапамога прадугледжана для такіх студэнтаў у плане навучання?

**В. Г. ЦІХІНЯ:** Мы ўлічылі тую акалічнасць, што за час службы ў арміі студэнты многае забыліся з пройдзенага матэрыялу. Шмат часу спатрэбіцца ім для таго, каб увайсці ў «вучэбную каляіну». Таму на пасяджэнні рэктарата было прынята рашэнне стварыць на факультэтах спецыяльныя групы для «студэнтаў-армейцаў». Заняткі ў іх будуць праводзіцца па індывідуальнай праграме.

Думаецца, што за навучальны год гэтыя студэнты змогуць набыць такі ж узровень ведаў, як і іх аднакурснікі, і ў далейшым спецыяльныя групы ім не спатрэбяцца.

Дарэчы, будуць створаны спецыяльныя групы і для тых, хто меў перад прызывам у армію запазычанасці, не паспяваў па якіх-небудзь дысцыплінах. Ім па жаданню можна прайсці паўторна гэты ж курс навучання або ліквідаваць прабел нават да пачатку заняткаў. Час на гэта будзе.

— Вы маеце на ўвазе час сельгасработ?

**В. Г. ЦІХІНЯ:** Так. Студэнты, дэмабілізаваныя з СА у жніўні-верасні, не будуць задзейнічаны на сельгасработах. Хіба што хто выкажа жаданне працаваць добраахвотна. Ды і ўвогуле сёлета мы плануем пачаць новы навучальны год з першага верасня, а не ў кастрычніку, як звычайна.

— У такім разе, відавочна, шмат хто са студэнтаў-ваеннаслужачых спозніцца да пачатку навучальнага года. І, магчыма, не на дзень, не на два. Ці не прыйдзецца ім праходзіць паўторнае навучанне?

**В. Г. ЦІХІНЯ:** Нават, калі нехта спозніцца больш чым на месяц, усё роўна будзе залічаны на адпаведны курс. А паўторнае навучанне мы прапануем па жаданню тым, хто адчувае ў ім неабходнасць.

Зрэшты, можа здарыцца, што такая форма не спатрэбіцца, бо наўрад ці хто захоча быць «другагоднікам». Тым больш, што скарг на затрымку ў войску ад студэнтаў універсітэта да нас яшчэ не паступала. Будзем спадзявацца, што усе нашы навучэнцы своечасова пачнуць вучобу.

— Пытанне на перспектыву. Сёлетні вымушаны перабор студэнтаў другога (у асноўным) курса ці не створыць дадатковыя цяжкасці для іх праз тры гады — у час размеркавання? У нас жа планавы выпуск спецыялістаў.

**В. Г. ЦІХІНЯ:** Менавіта таму няма прычын для хвалявання за будучае размеркаванне сённяшнім дэмабілізаваным студэнтам і іх аднакурснікам. Дзяржплан рэспублікі дадаткова выдзеліць месцы «звышпланавым» спецыялістам. А вось у наступным годзе будзе зменшаны прыём ва універсітэт на першы курс прыкладна на столькі, колькі студэнтаў прыйшло да нас зараз з войска. Але гэтае скарачэнне набору часовае. Чысовымі, спадзяёмся, будуць і ўсе праблемы, што ўзніклі з датэрміновым звальненнем студэнтаў.

Што ж, вайсковая каманда «Вольна!», як бачна, наўрад ці дазволіць студэнтам расслабіцца ў бліжэйшы час у іх цывільным жыцці. Цяжкія будні службы зменяцца напружанымі днямі і, безумоўна, начамі вучобы. І, магчыма, пра сваё армейскае жыццё хтосьці не раз яшчэ ўспомніць са шкадаваннем. Тым больш, што ваеннай справай многія сёлетнія студэнты-вайскоўцы не будуць займацца даволі доўга, прынамсі, усе астатнія гады вучобы ва універсітэце.

— Навучанне на ваеннай кафедры для звольненых у запас у жніўні-верасні гэтага года студэнтаў не абавязкова. Кожны «нежадаючы» стаць афіцэрам Савецкай Арміі павінен толькі напісаць рапарт з просьбай вызваліць яго ад заняткаў на ваеннай кафедры. Пакуль што такіх рапартаў няшмат. Відаць, не ўсе дэмабілізаваныя студэнты ведаюць пра неабходнасць іх напісання. Праўда, для тых, хто мае жаданне павысіць сваю кваліфікацыю, набыць афіцэрскае званне, дзверы на нашу кафедру не зачынены,— паведаміў выконваючы абавязкі начальніка ваеннай кафедры падпалкоўнік Аляксандр Міхайлавіч ГАЛЬПЕРЫН.

Кагосьці можа зацікавіць не толькі маральны, але і матэрыяльны стымул. Па ўказанню Міністэрства абароны СССР і Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі студэнтам, што праходзяць навучанне на ваеннай кафедры, будзе штомесячна выплочвацца дадаткова стыпендыя памерам ад 10 рублёў і больш.

Хачу, аднак, удакладніць, што прынцып добраахвотнасці навучання на ваеннай кафедры датычыць толькі сёлетніх звольненых у запас студэнтаў. У далейшым у адпаведнасці з Законам Канстытуцыі СССР аб усеагульным воінскім абавязку кожны студэнт будзе праходзіць адпаведны тэрмін навучання пэўнай ваеннай спецыяльнасці.

Матэрыялы рубрыкі падрыхтаваў
М. МАСТОЎСКІ.
Фота С. ГРЫЦА.

САМАРЭКЛАМА

# Экзамен на юнацкасць

Калі газета ў піку сваёй папулярнасці, яна звяртаецца да чытача.

Калі газеце цяжка, яна шукае падтрымкі таксама ў чытача.

Ён — галоўны абвінаваўца і абаронца адначасова. Ён жа — адзіны сведка яе ўзлётаў і яе няўдач.

«Беларускаму універсітэту» у гэтым годзе — шэсцьдзесят сем. І як наша газета выглядае ў свае 67: прамяніцца юнацкім імпэтам ці ўжо труха сыплецца — судзіць не нам, супрацоўнікам рэдакцыі. Але каб пачула яна: «Як добра выглядаеце на свае семдзесят», трэба, вядома ж, задумацца крышку раней. І не толькі стваральнікам «Беларускага універсітэта».

Таму і ўзнікла адзінае пытанне мікраанкеты: «Вашы адносіны да падпіскі на «Беларускі універсітэт?». Апытаныя студэнты хімічнага факультэта, напрыклад, удзельнічаць у падпісцы адмовіліся: «Там не пішуць пра студэнцкае жыццё!»

Паважаныя таварышы хімікі! Ну як жа не пішуць, калі кожны нумар газеты амаль увесь забіты «студэнцкімі» матэрыяламі. І пра асабіста вашае жыццё таксама. А вы не хацелі на працягу амаль усяго вучэбнага года нават забіраць з рэдакцыі «хімічныя» экземпляры.




Іншая справа, што нешта не задавальняе, не падабаецца. Пішыце, прыходзьце ў рэдакцыю! Паспрабуем знайсці ўзаемавыгаднае рашэнне...

Неабсалютная большасць апытаных студэнтаў з розных факультэтаў выказалі цвёрдую рашучасць выпісваць, праглядваць і нават калі-нікалі чытаць «Беларускі універсітэт».

На гэты вотум давер'я мы, рэдакцыйная калегія, можам толькі запэўніць, што:

— перадрукоўкі і фотаздымкі з «Плэй боя» і іншых папулярных заходніх часопісаў;

— інтэрв'ю з сусветнымі зоркамі кіно, эстрады і шоу-бізнесу;

— пікантныя гісторыі з асабістага жыцця вядомых палітычных дзеячаў

на старонках нашай газеты з'яўляцца не будуць.

Затое:

— калі вы не адчуваеце сябе безнадзейна за рысай беднасці;

— калі вы хоць крышачку неабыякавыя да лёсу сваёй газеты;

— калі вы лічыце сябе ў рэшце рэшт проста студэнтам

інтэрв'ю са студэнцкімі зоркамі вучобы, спорту і шоу-бізнесу, а таксама пікантныя гісторыі з асабістага жыцця выкладчыкаў вам забяспечаны.

«Беларускі універсітэт» — гэта і канадская газета «Гонтліт», дакладней, лепшыя яе матэрыялы спецыяльна для вас.

«Беларускі універсітэт» — гэта і вашы спробы пяра на старонцы «Майстроўня».

«Беларускі універсітэт» — гэта і «ЛІФТ» — лірычна-іранічны факультэт для ўсіх, хто валодае пачуццём гумару.

Сачыце за нумарамі газеты! Рубрыкі мяняюцца не з калейдаскапічнай хуткасцю, але пастаянна і насустрач вашым пажаданням. З былых пастаянных рубрык застаюцца яшчэ «Пінг-понг» — на любое ваша пытанне адкажа спецыяліст і «Аддзяленне сувязі» — гэта вашы лісты ў рэдакцыю.

Вашы ўсмешкі — нашы радасці.

Вашы слёзы — наш боль. Калі не яна (газета) дапаможа вырашыць вашы праблемы, зажывіць вашы балячкі, то хто ж тады?

Мы з табой, самы лепшы ў свеце чытач!

Мы разам, недаверлівы падпісчык!

Мы за вас, нашы студэнты і выкладчыкі!

А. КОКТЫШ,
наш кар.

## ДУМКІ ЎСЛЫХ

Сёння мы ўжо не здзіўляемся, калі чуем аб чарговым эксперыменце: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сферы абслугоўвання. У лепшым выпадку скептычна пасміхаемся і цярпліва чакаем вынікаў. Зусім іншая справа, калі эксперымент праводзіцца ў ВНУ, у час уступных экзаменаў. Тады мы хвалюемся: вядомая справа — у кожнага з нас ёсць родныя, знаёмыя, сябры, якія мараць стаць студэнтамі.

# ЗНОЎ ЭКСПЕРЫМЕНТ

### *Ці будзе ён удалым?*

*Такіх экзаменатараў я, бадай, бачыла ўпершыню. Чулых, добразычлівых, нават крыху паблажлівых. Яны разумелі, што ад іх залежыць многае. А таму не спяшаліся выводзіць у экзаменацыйным лісце «добра» ці «здавальняюча», а імкнуліся дапамагчы субяседніку знайсці неабходныя словы. Задавалі наводзячыя пытанні. Нарэшце, проста суцяшалі: «Не хвалюйцеся, вы правільна думаеце». Але ім, абітурыентам (асабліва, калі гэта слова спалучалася з тваім прозвішчам упершыню) супакоіцца было цяжка. Яшчэ цяжэй адказаць на тое пытанне, якое не паспеў паўтарыць, бо часу на падрыхтоўку да ўступных экзаменаў было не так ужо і многа. А калі ўлічыць, што экзамен гэты па беларускай мове?*

Так здарылася, што эксперыменты ў вышэйшых навучальных установах апошнім часам праходзяць ледзь ні штогод.

Дэмакратыя, галоснасць унеслі карэктывы ў падручнік гісторыі, і ў мінулым годзе школьнікі здавалі асобныя раздзелы гэтага прадмета, як кажуць, з уласнай галавы, амаль не маючы ніякай арыентацыі (газетная інфармацыя была часам зусім супрацьлеглая). Сёння новае патрабаванне часу — пашырэнне выкарыстання беларускай мовы. І на многіх факультэтах уводзяцца ўступныя экзамены па беларускай мове і літаратуры (вусна ці пісьмова). Добра, калі абітурыент вывучаў родную мову ў школе, а калі не? Ці не баімся мы, паддаўшыся эксперыменту, страціць здольных абітурыентаў, і ці гэтым выправім становішча, што склалася ў рэспубліцы?

Статыстыка сведчыць, што беларускай мове ў школах адведзена амаль у тры разы менш гадзін, чым рускай, што 94,5 працэнта ўсіх апытаных настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ста школ г. Мінска не задаволены існуючымі вучэбнымі праграмамі. Не менш важны бок справы — матэрыяльны. Дыспрапорцыя, якая склалася ў аплаце працы настаўнікаў рускай і беларускай моў (апошнія засталіся ў пройгрышы), прывяла да падзення прэстыжу выкладчыкаў нацыянальнай мовы, а таксама і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў.

...— Скажыце, калі ласка, што такое сінонімы, і з якой мэтай яны выкарыстоўваюцца? — пытаецца экзаменатар, выкладчыца кафедры беларускай мовы М. В. Дабрыян.

— Сінонімы — гэта словы...

А якія словы, выкладчыкам даведацца так і не ўдаецца. Не пачулі члены прыёмнай камісіі і адказы на некаторыя іншыя пытанні: «Што такое выказнік?», «Якія вы ведаеце лады дзеясловаў?», «Віды даданых сказаў?».

— Згадзіцеся, гэта не самыя горшыя адказы, калі ўлічыць, што ў групе няма медалістаў,— дзеліцца назіраннямі Марыя Васільеўна.— Зразумела, хацелася б чуць толькі выдатныя адказы. Але гэта не ад нас залежыць. Справа ў тым, што на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры экзамен па роднай мове абавязковы. Таму пытанні ў білетах стаяць вельмі падрабязныя, і адказы яны патрабуюць таксама канкрэтныя, дэталёвыя. Перакананa, калі вы наведаеце экзамен па беларускай мове і літаратуры, то ўражанне будзе значна лепшае. Там можна, як кажуць, сарыентавацца, нарэшце, нешта апусціць, калі не ўпэўнены ў правільнасці адказу, а тут на агульных фразах далёка не паедзеш.

І яшчэ пра адно новаўвядзенне хочацца сказаць. У гэтым годзе студэнты ўпершыню здаюць тры экзамены. Чацвёрты — пазаконкурсны. У чым яго сэнс?

Расказвае старшыня прадметнай камісіі па беларускай мове і літаратуры прафесар Д. Я. Бугаёў:

— Мэта новаўвядзення — больш значэння надаць спецыяльным дысцыплінам. Згадзіцеся, можна выдатна рашаць матэматычныя ўраўненні і быць не вельмі пісьменным (праўда, добра было б, каб гэта спалучалася). І яшчэ. Паменшыўшы спіс конкурсных экзаменаў, мы тым самым скароцім колькасць дысцыплін, якія вырашаюць лёс чалавека.

Усё гэта так. Але, паразважаўшы, закралася сумненне: ці дапаможам мы гэтым новым пунктам у Правілах прыёму ў ВНУ тым, хто туды паступае? Мяркуйце самі. Атрымаўшы тройку па звычайнаму экзамену, абітурыент мае магчымасць удзельнічаць у конкурсе. «Незалік» жа па пазаконкурснаму прадмету пазбаўляе яго гэтага.

Здаецца, зноў перагінаем палку. Давайце падумаем, ці здолеем мы, увёўшы на некаторых факультэтах (у будучым плануецца выключэнне зрабіць правілам) экзамен па беларускай мове, вырашыць тыя балючыя пытанні, звязаныя з беларускай мовай і наогул з нацыянальнай культурай, што хвалююць нас сёння?

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## ПРАЗ ШЧЫЛІНУ Ў ДЗВЯРАХ

# «Пяцёрка», мама!



Відавочная прыкмета таго, што пачаліся ўступныя экзамены,— паяўленне ва універсітэцкім скверыку, у двары (дзе не было свабодных лавак) тат і матуль абітурыентаў. Хто спадцішка («Сын даведаецца — пакрыўдзіцца»), хто ўсёй сям'ёй прыходзілі сюды ў тыя дні — і хваляваліся не менш за экзаменуемага. Калектыўна і паасобку. Карацей, чакалі сваіх дзяцей — безумоўна, з перамогай.

Экзамены, пытанні, тэмы — тут галоўны прадмет размовы. Думкамі яны, бацькі, там, у калідорах і аўдыторыях універсітэта, куды быў уваход па экзаменацыйных лістах. З хваляваннем сустракалі кожнага, хто выходзіў: ці не мой?..

— Мама, «пяцёрка»! — і радасныя слёзы, абдымкі. Гэты дзень для Рамуальды Размук стаў святам. Грамадазнаўства здала на «выдатна», і магла лічыць сябе студэнткай юрыдычнага факультэта.

— Рамуальда, хто больш хваляваўся: ты ці маці?

У адказ — шчаслівая ўсмешка, галава дзяўчыны схіляецца да пляча маці:

— Вой, не ведаю, мы з мамай — адно цэлае.

Першы тэлефонны званок пасля экзамена прама з універсітэта — дамоў, бацькам!

— Папа, поўны парадак! — Наташа Кулага паступіла на філалагічны, сачыненне напісала на «выдатна».

Але экзамены — гэта яшчэ і нечае паражэнне. І горкія слёзы — таксама на дваіх з маці.

С. ГРЫЦ.

ФОТА АЎТАРА.







## ТРЫ МЕСЯЦЫ ЗАСТАЛОСЯ ДА СТУДЭНЦКАГА ФОРУМУ

*Зацверджаны статус форуму, прадумана яго рабочая праграма, пачалося стварэнне дыскусійных цэнтраў. Прагучала прынцыповая падтрымка на ўзроўні Палітбюро ЦК КПСС — цяпер справа павінна пайсці хутчэй. Прэс-цэнтр пачаў перагаворы з праграмай «Взгляд». Выйшлі ў свет першыя прэс-рэлізы...*

*Што высветлілася на пасяджэннях Падрыхтоўчага камітэта Усесаюзнага студэнцкага форуму, калі абмяркоўвалася пытанне...*

### ...Аб льготах

«Сыты галоднага не разумее» — яшчэ раз пераканаліся студэнты — удзельнікі «круглага стала» з прадстаўнікамі Мінфіна, Дзяржплана, Дзяржкамадукацыі і Дзяржкамцэн.

Сітуацыя, сапраўды, няпростая. Транспартным прадпрыемствам і арганізацыям пры пераходзе на новыя формы гаспадарання хацелася б наогул вызваліць сябе ад льгот для пасажыраў (расходы на іх пазбаўляюць немалой часткі прыбытку). Ведамствы клапоцяцца аб сваіх мільёнах. А дзяржава, атрымліваючы спецыяліста з вузкім кругаглядам, ці не страчвае яна мільярды?

Ці далёка зможа заехаць савецкі студэнт? Не толькі на транспарце. За «круглым сталом» прагучалі вось такія лічбы: сёння падрыхтоўка спецыяліста нават у МДУ абыходзіцца ў 30—40 разоў (!) танней падрыхтоўкі спецыяліста аналагічнага профілю ў Вялікабрытаніі; калі раней за пяцігодку на гэтыя мэты ішло 2—3 мільярды, то на 13—14-ю пяцігодкі прынята рашэнне выдзеліць 18 мільярдаў, а гэта ўжо нешта значыць...

### ...Аб выкладанні грамадскіх навук

У СССР на выкладанне гуманітарных навук ідзе 9—13 працэнтаў вучэбнага часу, у ЗША — у навукова-тэхнічных ВНУ (!) — да 30 працэнтаў! Ёсць над чым паразважаць...

На абмеркаванне членаў камітэта кіраўніцтвам Дзяржкамадукацыі былі прапанаваны «Асноўныя напрамкі перабудовы выкладання грамадазнаўчых дысцыплін у сістэме народнай адукацыі і ўзмацненне іх ролі ў камуністычным выхаванні моладзі». З'явіцца адзіны курс «Уводзіны ў філасофію», знікнуць «Палітэканомія сацыялізму» і «Палітэканомія капіталізму»: прадугледжваецца «актыўна выкарыстоўваць элементы гісторыі эканамічнай думкі, гаспадаркі свету». Будзе ўведзены курс «Навуковы сацыялізм», максімальна набліжаны да паліталогіі. Захоўваецца дзяржаўны экзамен па марксізму-ленінізму, але цяпер змест праграмы вызначаюць саветы кафедраў грамадскіх навук ВНУ, яны ж прадугледжваюць і форму экзамена — вусны, пісьмовы, абарона рэфератаў. Могуць быць вызвалены ад экзаменаў студэнты, якія маюць выдатныя адзнакі па грамадазнаўчых дысцыплінах.

Гэты дакумент пакуль яшчэ патрабуе дапрацоўкі.

### ...Аб формах развіцця

студэнцкага руху ў СССР.

Да гэтае пары не вырашана пытанне аб стварэнні адзінай студэнцкай арганізацыі.

Ды й ці патрэбна яна? Мяркуючы па колькасці самых розных студэнцкіх камітэтаў, саюзаў, карпарацый — неабходна. Члены Падрыхтоўчага камітэта прапанавалі мноства варыянтаў — стварэнне занальных студэнцкіх камітэтаў, уласнага прафсаюза, нацыянальнага камітэта, студэнцкага савета СССР. Пакуль гэта толькі ідэі. Слова за форумам.

Па матэрыялах друку падрыхтавала М. ПАРХІМОВІЧ.

## САКРЭТ ФІРМЫ

### У ДЗЕСЯТКУ

**трэба было трапіць абітурыентам, каб пачуць ад экзаменатараў: «Выдатна!»**

Справа адбылася ў Ерэванскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, які першым з ВНУ краіны ацэньваў веды на ўступных экзаменах па дзесяцібальнай шкале. Папярэднічаў справе эксперымент. Ён пацвердзіў, што абітурыент пры пяцібальнай ацэнцы не поўнасцю раскрывае свае веды, мае менш магчымасцей у вырашэнні задач. Ініцыятыву калектыву інстытута падтрымалі ў Дзяржаўным камітэце СССР па народнай адукацыі. Зрэшты, абітурыентам не прыйшлося растлумачваць, да якой з двух альтэрнатыўных сістэм ставіцца з прыхільнасцю: новаўвядзеннем яны задаволены.

### ДАРОГА Ў КОСМАС

**пачынаецца з касмадрома**

Ім стаў першы ў краіне Інстытут касмічнай тэхнікі, арганізаваны ў Краснаярску на базе завода-втуза пры аб'яднанні «Красмашзавод», Новая ВНУ рыхтуе кваліфікаваных інжынераў па выпуску вырабаў са спецыяльных матэрыялаў, па электроннаму машынабудаванню, касмічных лятальных апаратах. Атрымаўшы арганізацыйную і фінансавую самастойнасць, кіраўніцтва інстытута разлічвае адкрыць на базе ІКТ і вытворчага аб'яднання «Красмашзавод» навукова-вытворчае аб'яднанне, а таксама цэх бесперапыннага навучання спецыялістаў машынабудаўніцтва.

### Амерыканскі універсітэт у Маскве?

**Нават на фоне ўсіх перамен ва ўзаемаадносінах Усход — Захад гэта прапанова выглядае больш чым неверагоднай.**

Гэтая шалёная, на погляд абывацеля, ідэя ўзнікла больш як год назад. Незалежныя амерыканскія універсітэты ўжо існуюць у Парыжы, Каіры і іншых сталіцах. Адрозніваюцца яны толькі тым, што выкладанне вядзецца амерыканскімі прафесарамі, безумоўна, на англійскай мове. «Урады краін, дзе размешчаны амерыканскія універсітэты, прызнаюць наш дыплом. Гэта, здаецца, галоўнае пытанне, якое яшчэ трэба вырашыць у Маскве»,— сказаў у інтэрв'ю газеце «Известия» адзін з распарадчыкаў савецка-амерыканскай сустрэчы «Разуменне каштоўнасцей заходняй цывілізацыі» Э. Лазанскі.

Бюджэт універсітэта будзе невялікім — 2—3 мільёны долараў у год. Заснавальнікі разлічваюць атрымаць гэтыя грошы з дабрачынных фондаў. Студэнтаў на факультэтах (эканамічным і палітычных навук) будзе 25—30 чалавек. Навучанне будзе бясплатным, а студэнцкая стыпендыя амаль такая ж, як і ў савецкіх ВНУ.

Пачаць заняткі ў амерыканскім універсітэце плануецца таксама ў неверагодна кароткі тэрмін з 1 верасня 1990 года.

## ДАВАЙЦЕ ЗНАЁМІЦЦА

# Добры дзень, першакурснікі!

Як адчуваеш сябе ў новай ролі — студэнта БДУ? Што ўжо паспеў заўважыць прыкметнага ў жыцці нашага універсітэта?

Самая няўдзячная справа — даваць парады: усё роўна кожнаму даводзіцца жыць уласным розумам. Але так хочацца навучыць цябе чаму-небудзь, перасцерагчы ад сваіх былых памылак. Напрыклад, не трэба было тады... А ведаеш, ужо і не памятаю, у чым я пралічыўся, калі быў першакурснікам. Цяпер, здаецца, так ўсё і павінна было адбывацца. Дык няхай і цябе не бянтэжыць твая нявопытнасць у новым жыцці. Нягледзячы на любыя цяжкасці, гэтыя першыя вераснёўскія дні ва універсітэцкім дворыку такімі прыгожымі будуць здавацца табе праз некалькі год, так захочацца вярнуць убачаныя тады твары і зноў пачуць самыя цікавыя словы выкладчыкаў...



*Асабліва хочацца пазбавіць цябе самых празаічных клопатаў: аб харчаванні, жыллі і г. д. Але, на жаль, нікуды табе ад іх не схавацца. Можа, ты будзеш гатаваць сабе ежу ў інтэрнаце. А можа, такой актыўнасцю адрозніваешся, што пашкадуеш аддаваць вольны час каструлям і патэльням. Тады — калі ласка, у цябе вялікі выбар: сталовая ў галоўным корпусе (ніжэй першага паверху), яшчэ адна ў хімічным, таксама і ў будынку, дзе займаюцца савецкія студэнты факультэта журналістыкі — па вуліцы Свярдлова, 7. Можна падсілкавацца і ў нашым універсітэцкім кафэ «Гаўдэамус». (яно знаходзіцца ў інтэрнаце № 7 па вуліцы Кастрычніцкай, 10-а).*

*Але, захапляючыся «грамадскім» харчаваннем, памятай, калі ласка, што сярод самых распаўсюджаных захворванняў у студэнтаў — гастрыт.*



*Вось і дайшлі да сумнага ў нашай размове. Няхай яно не датычыць цябе на працягу ўсіх пяці год вучобы і ўсё жыццё, але на ўсялякі выпадак...*

*Ва універсітэце ёсць уласная паліклініка — у будынку па вуліцы Бабруйская, 9. Тут можна звярнуцца за дапамогай да тэрапеўта і стаматолага (атрымаўшы спачатку, як і ў любой паліклініцы, талон у рэгістратуры, што на першым паверсе). А любога іншага спецыяліста (няхай усё ж не будзе патрэбы ў іх) можна знайсці ў гарадской студэнцкай паліклініцы № 33.*

*А цяпер пра больш цікавае.*



*Безумоўна, табе захочацца стаць чытачом самай буйной у рэспубліцы бібліятэкі — імя У. І. Леніна, тым больш, што яна размешчана ў зручным месцы. Але ў час студэнцкіх сесій там бывае так цесна і душна... І тады табе лепш звярнуцца ў нашу універсітэцкую бібліятэку, што на трэцім паверсе галоўнага корпуса. У пачатку навучальнага года тут абавязкова дадуць табе падручнікі па большасці вывучаемых прадметаў. А тыя, каторыя табе не дастануцца, ты знойдзеш у чытальных залах бібліятэкі, разам з мастацкай літаратурай і перыёдыкай.*



*А пачні ведаеш з чаго? З універсітэцкага музея. Няхай гэта слова не выклікае ў цябе ніякіх марудных асацыяцый. Тут ты пазнаёмішся з многімі універсітэцкімі традыцыямі, адчуеш яшчэ раз, які гэта гонар — вучыцца ў БДУ імя У. І. Леніна.*





*Упэўнены, што твае першыя дзеянні як студэнта не будуць абмежаваны толькі той інфармацыяй, якую ты знайшоў у першым нумары нашай газеты, бо універсітэт — гэта сапраўды шмат-шмат цікавага. Спадзяёмся, яно не абміне цябе. І ў хуткім часе ты знойдзеш для сябе тую справу, якая найбольш адпавядае тваім марам і здольнасцям. Можа, на сваім факультэце, можа, сярод агульнауніверсітэцкіх аб'яднанняў. Не толькі ж вучоба, ці не так? Ёсць яшчэ палітычны клуб «Палітыкус», народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», народны танцавальны ансамбль «Крыжачок», народная харавая капэла і г. д.*



*Нядаўнія студэнты універсітэта вельмі пазайздросцяць табе: у нас нарэшце пабудаваны спартыўны комплекс на месцы звычайнага стадыёна, як раз да твайго паступлення — можаш лічыць гэта падарункам за настойлівасць і экзаменацыйныя хваляванні. Комплекс уключае чатыры спортзалы, басейн — было б толькі жаданне ўдасканальваць сябе фізічна.*





*Прымі на заканчэнне адно запрашэнне. Вечнае і на любую колькасць асоб (можна прыходзіць з сябрамі). Мы спадзяёмся, што вы будзеце не толькі чытачамі газеты, але і яе карэспандэнтамі. Заходзьце да нас, калі ласка, з любымі пытаннямі, праблемамі, ідэямі і прапановамі. Адрас можна знайсці ў любым нумары «Беларускага універсітэта».*

*Шчаслівага вам шляху ў навуцы і жыцці!*




БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона зорка» МВПА імя Я. Коласа.
31 жніўня.
Зак. 1628
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.